Казлоўская Л.І.,
дацэнт

## ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНАГА МАЙСТЭРСТВА САЦЫЯЛЬНЫХ ПЕДАГОГАЎ-АРГАНІЗАТАРАЎ ВОЛЬНАГА ЧАСУ Ў ПЕРЫЯД ПРАКТЫКІ

Адной з важных умоў павышэння якасці падрыхтоўкі сацыяльных педагогаў-арганізатараў вольнага часу з'яўляецца ўдасканаленне формаў арганізацыі вытворчай практыкі.

У Беларускім універсітэце культуры распрацаваны некалькі напрамкаў арганізацыі і правядзення практыкі студэнтаў.

Вельмі перспектыўным з'яўляецца арганізацыя навучальнага працэсу ва ўмовах канкрэтнага соцыуму. Значная частка вучэбных заняткаў (практычных, лабараторных, індывідуальных) па спецыяльных дысцыплінах «Тэхналогія арганізацыі гульнявой дзейнасці», «Арганізацыя рэкрэацыйнай дзейнасці», «Арганізацыя пазнавальнай дзейнасці» і іншых перанесена на базы практыкі, якімі з'яўляюцца школы, палацы культуры, дзіцячыя аздараўленчыя цэнтры, цэнтры рэабілітацыі, дзіцячыя дамы, цэнтры дзіцячай творчасці. Студэнты тут набываюць канкрэтныя веды. Вучэбны матэрыял прадмета як бы ажывае для студэнта ў яго дзейнаснай форме, у форме ажыццяўляемай ім праграмы па арганізацыі вольнага часу.

Важнай умовай павышэння прафесійнага майстэрства сацыяльных педагогаў-арганізатараў вольнага часу з'яўляецца вытворчая практыка, якая б была працягам навучальнага працэсу ва ўмовах канкрэтнага рэгіёна. Праграма практыкі на кожным курсе будуецца з улікам паслядоўнасці навучальнага працэсу, што дае магчымасць студэнтам замацаваць набытыя веды і ўменні ва ўмовах канкрэтнай дзейнасці. Так, на другім курсе студэнты размяркоўваюцца на падгрупы (8-10 чалавек) і працуюць на базе практыкі пад кіраўніцтвам выкладчыка. Змест практыкі складаецца з наступных задач: знаёмства з арганізацыяй сацыяльна-культурнай дзейнасці пэўнага соцыуму (школа, цэнтр рэабілітацыі, аздараўленчы цэнтр і інш.); аказанне практычнай дапамогі канкрэтнай установе ў распрацоўцы сцэнарыя і пастаноўцы конкурсна-гульнявой або фальклорнай праграмы; аказанне дабрачыннай дапамогі найбольш неабароненым пластам насельніцтва (сляпым, глуханямым, інвалідам і іншым).

На старэйшых курсах студэнты ажыццяўляюць дыягнастычны этап у педагагічнай арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці дзяцей, падлеткаў і дарослых. Вывучаюцца культурныя інтарэсы і запыты насельніцтва ў канкрэтным соцыуме і з іх улікам распрацоўваюцца праграмы па арганізацыі вольнага часу, мадэлі дзейнасці культурнага цэнтра. Пры гэтым на кожнай базе практыкі працуе не больш 2-х чалавек, што дазваляе факусіраваць увагу на індывідуальнай рабоце студэнта, выявіць ступень самастойнасці пры выкананні задання, глыбей замацаваць набытыя веды і ўменні ў прафесійнай дзейнасці. Разам з тым у праграмах, што распрацоўваюцца студэнтамі, з'яўляюцца і інавацыйныя элементы: навізна зместу, улік культурных традыцый рэгіёна, дэмаграфічных і сацыяльна-эканамічных асаблівасцей яго насельніцтва, своеасаблівы сцэнарны ход, новыя арганізацыйна-метадычныя ўмовы.

У той жа час асобныя вынікі даследаванняў паказваюць, што прадукцыйнае праходжанне практыкі сацыяльных педагогаў-арганізатараў вольнага часу магчыма пры забеспячэнні педагагічнага кіраўніцтва ёй. Педагог, які ажыццяўляе кіраўніцтва вытворчай практыкай, акрамя спецыяльных уменняў і навыкаў, павінен мець глыбокія веды ў галіне псіхалогіі. Яму неабходны арганізацыйна-метадычныя ўменні, спецыфічныя здольнасці.

Заканчваецца практыка індывідуальнай абаронай выкананых практычных заданняў і канферэнцыяй па выніках практыкі.

Залатар В.А.,
выкладчык

## МЕТОДЫКА ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ ДА КАРЭКЦЫЙНАЙ РАБОТЫ ПРАЗ ДЗІЦЯЧЫ ТЭАТР

У сучасных умовах вядучым відам дзейнасці сацыяльнага педагога з'яўляецца арганізацыя развіццёва-творчай дзейнасці дзяцей і дарослых. Таму рыхтаваць сацыяльных педагогаў неабходна такім чынам, каб кожны з іх не толькі ведаў агульныя прынцыпы арганізацыі дзейнасці асобы ў сферы вольнага часу, але і мог бы рэалізаваць іх у жыцці.

Абавязковай умовай эфектыўнай падрыхтоўкі студэнтаў з'яўляецца павышэнне іх кваліфікацыі ў адным з канкрэтных відаў дзейнасці, якая выбіраецца імі для спецыялізацыі.

Неабходнай якасцю будучага спецыяліста з'яўляецца наяўнасць захаплення, цікавасці да абранай галіны дзейнасці, глыбіні спецыяльных ведаў.

Асобага вывучэння патрабуюць пытанні падрыхтоўкі сацыяльных педагогаў да карэкцыйнай дзейнасці. Гэта дзейнасць накіравана на разбурэнне пэўных установак, уяўленняў, каштоўнасцей, матываў, стэрэатыпаў паводзін і фарміраванне новых з мэтай стварэння умоў для самарэалізацыі асобы ў грамадстве.

Сацыяльныя дэтэрмінанты асацыяльных паводзін асобы шматлікія:

- сям'я, у якой дэфіцыт клопату і любові ў аднаго ці абодвух бацькоў да дзіцяці, нераваага штрафнога ўздзеяння на дзіця, празмерная апека дзіцяці з боку аднаго ці абодвух бацькоў, выхаванне дзіцяці ў духу непавагі да грамадскіх нормаў і формаў сацыяльнага кантролю і інш.;

- школа, дзе выхаваўчая работа накіравана на дасягненне паслухмянасці, дысцыпліны, парадку. Арганізацыя, формы, метады навучання не ствараюць магчымасцей для поспеху кожнага дзіцяці; праца ў школе накіравана на засваенне ведаў, а выхаваўчай рабоце не надаецца неабходнай увагі;

- група, калектыў, якія з'яўляюцца фактарам асацыяльных паводзін дзяцей, калі прысутнічаюць асацыяльныя элементы ў сістэме нормаў, каштоўнасцей, якімі кіруюцца члены групы ў сваіх паводзінах, калі ўзаемаадносіны ў групе складваюцца на аснове аўтарытарнага стылю.

Дапамога, якую аказвае сацыяльны педагог, мае характар карэкцыйнай дзейнасці ў тым выпадку, калі яе мэта - разбурэнне элементаў асацыяльных паводзін і фарміраванне ўстойлівай і паслядоўнай сістэмы нормаў і каштоўнасцей, якія адпавядаюць нормам і каштоўнасцям грамадства. Гэта патрабуе ўвядзення новай дзейнасці, якая адпавядае спецыфіцы карэкцыйнай работы. Такой дзейнасцю можа быць удзел у рабоце дзіцячага тэатра лялек. Тэатр можа аказаць дапамогу ў рабоце з «цяжкімі» дзецьмі; у ажыццяўленні сацыяльнай дыягностыкі і падрыхтоўцы мадэлі карэкцыйнай дзейнасці. Праца па вырабу цацак і лялек можа выступаць як тэрапеўтычны сродак. Асаблівае задавальненне атрымліваюць дзеці, калі вырабленыя імі цацкі і лялькі выкарыстоўваюцца ў спецыяльных гульнях, прадстаўленнях, спектаклях.

Методыка падрыхтоўкі студэнтаў да карэкцыйнай дзейнасці ўключае:

- тэхналагічныя прыемы вырабу цацак і лялек (даюцца правілы іх крою, пашыву і ўпрыгожвання);

- тэхніку сацыядраматызацыі (вызначаюцца характэрныя «сакрэты» жывёл, звяроў, птушак, студэнт падбірае гісторыі з пэўным сюжэтам, у якім праяўляюцца характары герояў);

-псіхатэрапеўтычныя гульні (распрацоўваюцца спецыяльныя гульні, якія дапамагаюць вырашэнню тых ці іншых праблем).

Зубра А.С.,
дацэнт

## ПЕРАДУМОВЫ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ НАВУЧАННЯ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

У Рэспубліцы Беларусь большасць вышэйшых навучальных устаноў атрымалі статус універсітэта. У іх ліку і Беларускі універсітэт культуры. Задача апошняга - даваць сваім навучэнцам цэласнае ўяўленне аб культуры. Калі універсітэт будзе выконваць гэту задачу, тады з'явяцца дзеячы культуры з філасофскім складам розуму, тады з'явяцца настаўнікі школы, выкладчыкі для універсітэта - прафесіяналы.

Англійскі вучоны Джон Ньюман (1801-1890) пісаў: «У адрозненне ад іншых навучальных устаноў універсітэт павінен не навучаць, а адукоўваць сваіх студэнтаў, таму што ў параўнанні з «навучаннем» адукацыя есць больш высокае слова». Адукацыя прадугледжвае ўздзеянне «на нашу разумовую прыроду, на складванне характару». Гаворка ідзе аб пераносе цэнтра цяжару з падрыхтоўкі спецыяліста на адукаванасць асобы. Сапраўдная адукаванасць непасрэдна звязана з маральнасцю, патрабавальнасцю да сябе, здольнасцю пераадолець сябе, г.зн. падняцца над сабой. І, безумоўна, сапраўдная адукаванасць звязана з адказнасцю. Толькі адукаваная асоба ва ўмовах рынкавых адносін здольна прадукцыйна працаваць, прымаць правільныя рашэнні, паважаць праўду, быць канкурэнтназдольнай.

Але паўстае цяжкае пытанне: як гэта зрабіць патрэбнасцю нашага студэнта? Неабходна вылучыць на першы план вартасць асобы, элемент спаборніцтва, «белую» зайздрасць да добрага, выдатнага, высокага. Тады ў студэнтаў будзе прага да вучобы, якая прымушае інтэлектуальна і маральна напружвацца.

Сапраўдная культура асобы немагчыма без адзінства ўнутранага духоўнага свету (інтэлектуальная, эмацыянальная, валявая культура) і формы знешніх паводзін (візуальная культура). Адзінства зместу і формы культуры асобы праяўляюцца ў яе адносінах, сувязях, пазнанні і дзейнасці. Каб дасягнуць гэтага, неабходна, на наш погляд, наступнае. 1. Вучыць студэнтаў уменню вучыцца. Увесці новыя вучэбныя прадметы: «Культура разумовай працы студэнта», «Рыторыка», «Дзелавая этыка». 2. Павялічыць час на самастойную работу, істотна паменшыўшы час на аўдыторныя заняткі (скараціўшы іх да 26 - 14 гадзін у тыдзень).

Сення праблема ў тым, як вучыць лепш, але за меншы час. Размова ідзе перш за ўсе аб выключэнні са зместу адукацыі вялікай колькасці звестак аб падзеях: што? дзе? калі? А вучыць адказваць на пытанні: як? і чаму? За пытаннем: